# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
8 красавіка
1993 года
№ 6(1693)


## КРАЮ МОЙ РОДНЫ

*Тры дзесяткі новых карцін складаюць экспазіцыю выставы члена Саюза мастакоў* **РБ КАСТУСЯ КАЧАНА**, *якая зараз адкрыта ў Доме мастацтваў.*

*Здавён знаёмыя мясціны — ваколіца вёскі, дарога, расцярушаная жоўтым лісцем, старыя завулкі заходнебеларускіх мястэчак. Сюжэты карцін простыя, а фарбы няхідкія. Глядзіш і верыш у тое, што мастак пасапраўднаму любіць зямлю, на якой жыве, яе сціплыя, зусім не экзатычныя краявіды. Тое, што ў экспазіцыі няма яркіх летніх палотнаў, а найбольш восеньскія і зімовыя, наводзіць на думку аб асобым настроі душы мастака, стане лёгкага смутку.*

Фота С. ВАСІЛЬЕВА.



ГУТАРКІ З НАГОДЫ...

## ПЕРАРЭГІСТРАЦЫІ

*Па словах* **Зміцера СЛОЖКІНА**, *намесніка старшыні Задзіночання беларускамоўных студэнтаў, самая нацыянальна-свядомая сярод новаўтвораных камерцыйных структут — «Дайнова». Не тое, што без яе ЗБС зусім знікла б, але дзякуючы фінансавай падтрымцы нацыянальнай «буржуазіі» — жыць намнога лягчэй.*

Услед за рэгістрацыяй друкаванага органа Задзіночання — газеты «Студэнцкая думкая» тыдзень назад пачалася афіцыйная перарэгістрацыя сяброў арганізацыі, пасля якой «зэбэсаўцы» атрымаюць пасведчанні. Пакуль жа лічыцца, што іх каля 700.

Арганізацыйныя праблемы афіцыйнага афармлення ніколі не перашкаджаюць іх нацыянальна-асветніцкай дзейнасці—зараз ідзе распрацоўка статута студэнцкага самакіравання.

Таццяна КАЗАК.

СУСТРЭЧЫ

## «ОЙ, ДЭКАНЕ, АДПУСЦІ НА СПАТКАННЕ»

*З такімі словамі выпускнікі і студэнты філалагічнага факультэта звярнуліся да дэкана* **Алега Антонавіча ЛОЙКІ** *на вечарыне-сустрэчы ў канцы сакавіка.*

Гэта сапраўды была сустрэча-спатканне. Віншаванні, успаміны: філфак акадэмічны, філфак паэтычны, філфак, чые спевы чутныя і ў галоўным корпусе, філфак вясёлых і знаходлівых.

Як на кожным спатканні, было шмат прыемных нечаканасцей. Спяваў Алег Атаманаў, а дэкан пад шчырыя апладысменты ўсіх тых, хто сабраўся, танцаваў на сцэне вальс.

Таццяна КАЗАК.

АЎДЫТОРЫЯ

## ЯК ЛЕКЦЫЮ ЧЫТАЎ ПАСОЛ

*Пад «агонь» студэнцкіх пытанняў трапіў днямі надзвычайны і паўнамоцны пасол Турэцкай рэспублікі* **Тансу ОКАНДАН**. **Магчыма, моўны абстрэл быў падштурхнуты ўдалым жартам пасла аб тым, што студэнцкія месцы не больш камфартабельныя, чым кафедра выкладчыка, бо калі аўдыторыя не задае пытанняў, самы час паклапаціцца аб гэтым лектару.**

Лекцыя была не «вясельнай», а самай звычайнай, вучэбнай — «Функцыі дыпламата». Праслухалі яе студэнты ўсіх трох курсаў утворанага паўгода таму аддзялення міжнародных адносін гістарычнага факультэта. Пачатая беларускамоўным прывітальным словам загадчыка кафедры міжнародных адносін **Аляксандра Віктаравіча ШАРАПА** далей лекцыя гучала па-англійску. За выключэннем пытанняў на англійскай, французскай і беларускай мовах.

Тансу Окандан прыехаў у нашу краіну раней за ўсіх астатніх паслоў, таму што Турцыя была самай першай дзяржавай, якая прызнала незалежнасць Рэспублікі Беларусь. Да таго ён ужо працаваў у Бельгіі, Кувейце, ЗША, Рыме.

Гэта не першая і не апошняя лекцыя замежных спецыялістаў на аддзяленні. За некалькі тыдняў да выступлення Хансу Окандана лекцыю «Беларусь вачыма немцаў» прачытаў вядомы палітычны дзеяч Германіі Вальфган Грыгер, а праз тыдзень пасля — надзвычайны і паўнамоцны пасол Рэспублікі Польшча на Беларусі Яніна-Эльжбэта Смулэк. Запланаваны таксама курс лекцый аб знешняй палітыцы ФРГ прафесара Свабоднага універсітэта Заходняга Берліна Йоханеса Шлотца.

З. МАРАВА.

## Веснавыя рытмы пануюць у Мінску




*Два дні пляцоўка Мінскага Палаца спорту была ва ўладзе міжнароднага турніра «Веснавыя рытмы-93». Дзесяткі пар артыстаў з Латвіі, Беларусі, Эстоніі, Расіі падарылі мінчанам сапраўднае свята танца. Гледачы былі зачараваны цудоўным відовішчам. Але для саміх танцораў гэта было спаборніцтва. З перамогамі і няўдачамі.*

*Асаблівы поспех выпаў на долю мінчан Вольгі Цяцеркінай і Паўла Чарданцава. Яны сталі пераможцамі сярод юніёраў у абедзвюх праграмах — еўрапейская і лацінаамерыканскай.*

С. ВАСІЛЬЕЎ, фота аўтара.

ЛЕТА-93

## КАШТОЎНАЯ РАМАНТЫКА

*Каб не было пакутліва балюча за пражытыя без акрэсленай мэты летнія канікулы, нядрэнна было б правесці іх у будаўнічым атрадзе.*

Цэнтр маладзёжных ініцыятыў універсітэта і Рэспубліканская служба занятасці моладзі заключылі пагадненне на фарміраванне атрадаў у Цюмень, Уральскую, Архангельскую і Мінскую вобласці. А на сельскагаспадарчыя работы — у Малдову і Стаўраполле.

Выдаткі на дарогу — за кошт арганізацый, зацікаўленых у памочніках, колькасць якіх неабмежаваная.

За даведкамі можна звяртацца ў Цэнтр маладзёжных ініцыятыў (пакой 306 галоўнага корпуса) да **Аляксандра АНДРЫЯЛОВІЧА.**

Ёсць шанс ператварыць рамантыку ў спосаб здабывання грошай. Паспрабуйце!

Дазналася Таццяна КАЗАК.

ВЫ ЧУЛІ?

## НЯМЕЦКУЮ ВЫВУЧУ Я ДЛЯ ТАГО, КАБ СТАЦЬ ГУВЕРНАНТКАЙ, НАРЭШЦЕ

*Узнікшая ў Заходняй Еўропе арганізацыя «Аў пэйр» мае філіялы ў розных краінах свету. І нават у блізкім замежжы — у Літве. Асноўная мэта яе дзейнасці — пазнаёміць прадстаўнікоў розных краін з культурамі, што існуюць у свеце, дапамагчы ім адшукаць за мяжой новых сяброў і ўдасканаліць свае прафесіянальныя навыкі.*

Нарэшце і ў студэнтаў нашага універсітэта ўзнікла магчымасць нароўні з іншымі паспрабаваць свае сілы на спрыяльнай глебе замежжа. Якім чынам? Адказвае старшыня Цэнтра маладзёжных ініцыятыў **Іван РАК.**

**— Такім чынам, кожны, хто пажадае,можа трапіць у Германію і з простага студэнта ператварыцца ў важнага гувернанта ці строгую гувернантку?**

— Амаль што. Трэба толькі нядрэнна валодаць нямецкай мовай, мець вопыт работы з дзецьмі, узрост ад 18 да 24 гадоў і абавязковую сярэднюю адукацыю. Перавагу будуць мець тыя прэтэндэнты, хто згодны працаваць у нямецкіх сем'ях цэлы год. Магчымы і паўгадавы варыянт.

— ***У абавязкі нованароджанага выхавацеля ўваходзіць вучыць дзяцей чаму-небудзь, выкладаць якія-небудзь прадметы ці толькі сачыць за паводзінамі малых?***

— Па-першае, сачыць прыйдзецца не толькі за малымі. За дзецьмі ад немаўлят да пятнаццацігадовых падлеткаў. Падругое, у абавязкі ўваходзіць і дапамога па гаспадарцы.

**— І ўся гэтая папялушкіна праца — за магчымасць паглядзець на далёкую Германію?**

— Плюс магчымасць займацца ўдасканальван нем нямецкай мовы, быць забяспечаным харчаваннем і медыцынскім страхаваннем, 380 марак у месяц на асабістыя выдаткі і за кожныя 6 месяцаў працы — тыдзень адпачынку.

**— Мяне зацікавілі гэтыя прапановы, што далей?**

— Звяртайся ў 201 пакой галоўнага корпуса, каб атрымаць пакет дакументаў і анкет, дзе, дарэчы, прапануецца яшчэ і растлумачыць, чаму ты пажадала выхоўваць нямецкіх дзяцей.

Гутарыла Таццяна КАЗАК.

## СТУДЭНТ ВЫБІРАЕ СТАЛОЎКУ

*Што самае важнае для студэнта, апроч лекцый семінараў, экзаменаў і бібліятэк? Ну, вядома, абедзенны перапынак. Калі ляшчэ ўлічыць, што большасць студэнтаў вымушаны лёсам быць жыхарамі інтэрната, то наведванне установы пад назвай «Сталовая» становіцца яшчэ больш жаданым. Па апытанню, праведзенаму «Беларускім універсітэтам» сярод некаторай часткі прадстаўнікоў розных факультэтаў, найбольшай папулярнасцю карыстаецца сталоўка журфака, дзе можна адносна нядорага і смачна пад'есці.*

Пастаяннымі наведвальнікамі былой «цэкоўскай» сталоўкі, што непадалёку ад гістфака, з'яўляюцца каля дваццаці прадстаўнікоў найбольш багатай часткі універсітэцкай моладзі. Спрацоўвае прынцып: хочаш адчуць сябе чалавекам — плаці. У чым нельга пазайздросціць студэнтам філфака. якім, каб напоўніць страўнік, даводзіцца пераадольваць шлях ад вучэбнага корпуса да будыніны інтэрната, дзе размяшчаецца даступны для студэнтаў буфет.

Што датычыцца сталоўкі галоўнага корпуса, то ў ёй па-ранейшаму перад тым, як пакласці ў рот жаданы кавалак, трэба заплаціць за тое, каб было чым адправіць страву ў належнае месца (відэльцы і лыжкі ўсё яшчэ за грошы). Багатым асартыментам страў дадзеная кропка харчавання пахваліцца не можа, чаго нельга сказаць пра цэны, якія бягуць навыперадкі са студэнцкімі стыпендыямі.

Вольга МАМЧЫЦ.

ПРАЕКТ

# КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

## ПРАФСАЮЗНАГА КАМІТЭТА І АДМІНІСТРАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА НА 1993

## РАЗДЗЕЛ I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Гэты калектыўны дагавор пасля папярэдняга абмеркавання ў падраздзяленнях заключаецца паміж калектывам супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які прадстаўлены прафсаюзным камітэтам, і адміністрацыяй універсітэта, якая прадстаўлена рэктарам. Калектыўны дагавор заключаецца тэрмінам на 1 год і ўступае ў дзеянне з моманту падпісання яго абодвума бакамі. Асноўнымі прынцыпамі заключэння калектыўнага дагавору з'яўляецца сацыяльнае партнёрства і раўнапраўе бакоў.

Прынятыя палажэнні дагавору распаўсюджваюцца на ўсіх членаў калектыву. Адміністрацыя абавязуецца знаёміць з гэтым калектыўным дагаворам кожнага, хто паступае на работу. Адміністрацыя і прафкам абавязуюцца праз месяц з дня прыняцця дагавору памножыць яго і давесці да ўсіх службаў універсітэта і прафсаюзных арганізацый.

1.2. Адміністрацыя, у асобе рэктара універсітэта, і прафсаюзны камітэт, у асобе старшыні прафкама, абавязуюцца забяспечыць бесперапынны кантроль за выкананнем усіх умоў дагавору.

1.3. Прамежкавыя справаздачы аб ходзе выканання калектыўнага дагавору заслухоўваюцца раз ў паўгода на сумесных пасяджэннях рэктарата і прафкама з запрашэннем адказных і зацікаўленых асоб. Справаздачу аб выніках выканання абавязацельстваў за год адміністрацыя і прафкам універсітэта праводзяць на канферэнцыі працоўнага калектыву.

1.4. Адміністрацыя і прафкам абавязуюцца інфармаваць супрацоўнікаў універсітэта аб усіх рашэннях, якія прымаюцца: размеркаванне жылля, фондавага абсталявання, прэміраванне і г. д.

1.5. Пры невыкананні палажэнняў калектыўнага дагавору, паўторным парушэнні тэрмінаў выканання абавязацельстваў прафкам, канферэнцыя працоўнага калектыву разглядаюць пытанне аб адпаведнасці займаемай пасадзе адказнага выканаўцы.

## РАЗДЗЕЛ II. ПАЛЯПШЭННЕ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ УМОЎ СУПРАЦОЎНІКОЎ

2.1. Адміністрацыя і прафкам універсітэта абавязуюцца пастаянна кантраляваць ход будаўніцтва 120-кватэрнага жылога дома па вуліцы Варанянскага.

*Адк.: рэктар, старшыня прафкама.*

2.2. Адміністрацыя і прафкам абавязуюцца выканаць усю неабходную работу ў 1993 годзе дзеля забеспячэння пачатку будаўніцтва дома для супрацоўнікаў па вуліцы Аэрадромнай.

*Адк.: рэктар, старшыня прафкама.*

2.3. Выдзеліць са сродкаў фонду навукова-тэхнічнага і сацыяльнага развіцця БДУ 1,5 млн. рублёў для аплаты ў памеры 70 працэнтаў кошту пуцёвак, што набываюцца супрацоўнікамі самастойна.

*Адк.: галоўны бухгалтар, старшыня прафкама.*

2.4. Аплочваць са сродкаў сацыяльнага страхавання санаторныя пуцёўкі, якія выдаюцца супрацоўнікам універсітэта, у памеры 95 працэнтаў ад іх кошту.

*Адк.: галоўны бухгалтар, старшыня прафкама.*

2.5. Аказваць матэрыяльную дапамогу малазабяспечаным сем'ям, якія маюць дзяцей і даход на аднаго члена сям'і, што не перавышаў бы дзвюх мінімальных заработных плат, адзін раз у год у памеры аднаго акладу па займаемай пасадзе.

*Адк.: галоўны бухгалтар, агульна-прававы аддзел.*

2.6. Дазволіць кіраўнікам структурных падраздзяленняў універсітэта ў адпаведнасці з арт. 5 КЗаП Рэспублікі Беларусь прадастаўляць працуючым жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 14 год, адзін раз у месяц дадатковы выхадны з захаваннем заработнай платы.

*Адк.: начальнік аддзела кадраў.*

2.7. Жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 год, прадастаўляць дадатковы неаплочваемы адпачынак з захаваннем месца работы (пасады).

*Адк.: аддзел кадраў, агульна-прававы аддзел.*

2.8. У адпаведнасці з арт. 76 КЗаП РБ прадаставіць права адміністрацыі даваць неаплочваемы адпачынак працягласцю да аднаго месяца асобам вучэбна-дапаможнага і абслугоўваючага персаналу ў ліпені-жніўні 1993 года.

*Адк.: рэктарат.*

2.9. Аказваць супрацоўнікам і студэнтам матэрыяльную дапамогу (з фонду сацыяльнай дапамогі рэктара і прафкама).

*Адк.: рэктарат, старшыня прафкама.*

2.10. Пры прадастаўленні супрацоўнікам чарговага адпачынку выплочваць лячэбную дапамогу ў памеры, які залежыць ад эканоміі фонду аплаты працы.

*Адк.: рэктарат.*

2.11. Выплочваць аднаразовую дапамогу:

— калі супрацоўнік уходзіць на пенсію ў памеры месячнага акладу па займаемай пасадзе;

— сям'і памёршага супрацоўніка, а таксама пры смерці блізкіх сваякоў, якія былі на ўтрыманні супрацоўнікаў універсітэта, у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

*Адк.: рэктарат, прафкам.*

## РАЗДЗЕЛ III. АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ, НАРМІРАВАННЕ. ЗАКЛЮЧЭННЕ І СКАСАВАННЕ ПРАЦОЎНЫХ ДАГАВОРАЎ

3.1. Адміністрацыя універсітэта ажыццяўляе раўнамерную загрузку выкладчыкаў па семестрах, не дапускае больш 6 аўдыторных гадзін па асноўнай пасадзе, 9 гадзін з улікам сумяшчальніцтва, правядзення больш аднаго экзамена ў дзень.

Работу ў выхадныя дні дазваляць у выключных выпадках, афармленне яе праводзіць у адпаведнасці з КЗаП па заяве выкладчыка.

*Адк.: рэктарат, дэканы факультэтаў.*

3.2. Устанавіць аб'ём вучэбнай нагрузкі ў разліку на выкладчыка ў сярэднім 720 гадзін, пры тым, лекцыйна-семінарская нагрузка павінна быць не менш за 130 гадзін. Перавыкананне вучэбнай нагрузкі аплочваць ва ўстаноўленым парадку.

Да ўдакладнення сярэдняй вучэбнай нагрузкі звярнуцца ў верасні 1993 года, з улікам прапаноў вучэбна-метадычнага ўпраўлення.

*Адк.: рэктарат.*

3.3. Дазволіць штатным супрацоўнікам БДУ па рашэнні кафедры выкананне пагадзіннай вучэбнай нагрузкі да 0,5 штатнай вучэбнай нагрузкі.

**Адк.: вучэбна-метадычнае упраўленне.**

3.4. Забяспечыць умовы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў па вылічальнай тэхніцы, вывучэнню беларускай мовы і замежных моў у адпаведнасці з планамі падраздзяленняў.

*Адк.: рэктарат.*

3.5. Устанавіць аб'ём аўдыторных вучэбных заняткаў у 1993—1994 навучальным годзе не больш за 36 гадзін у тыдзень.

**Адк.: дэканы факультэтаў.**

3.6. Звальненне супрацоўнікаў, якія не дасягнулі пенсійнага ўзросту, па скарачэнні колькасці ці штатаў работнікаў не дапускаецца, калі магчымы перавод па іх згодзе на іншыя пасады, што займаюцца асобамі, якія маюць права на поўную пенсію.

*Адк.: аддзел кадраў, агульна-прававы аддзел.*

3.7. Звальненне супрацоўнікаў па ініцыятыве адміністрацыі ў выпадку грубага парушэння працоўнай дысцыпліны (арт. 33 КЗаП РБ), а таксама па дасягненні пенсійнага ўзросту праводзіцца з абавязковым паведамленнем у прафкам. У астатніх выпадках са згоды прафкама.

*Адк.: аддзел кадраў.*

3.8. Прадаставіць адміністрацыі права афармлення на работу супрацоўнікаў універсітэта, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, і тых, хто прымаецца нанова — па дагаворы.

*Адк.: рэктарат, старшыня прафкама.*

3.9. Пры звальненні супрацоўнікаў па скарачэнні колькасці ці штату работнікаў памер выхадной дапамогі павялічваецца на 10 працэнтаў сярэднемесячнага заработку за кожны год працы ва універсітэце звыш 5 год.

*Адк.: галоўны бухгалтар.*

3.10. Аплату працы праводзіць у адпаведнасці з зацверджанымі стаўкамі і акладамі з 4 па 6 і з 16 па 18 даты кожнага месяца, а ў выпадку супадзення названых дат з выхаднымі днямі — у дні, папярэднія выхадным.

Забяспечыць атрыманне заработнай платы праз ашчадны банк (па заявах) да 12 даты кожнага месяца.

Кожны квартал даводзіць да ведама падраздзяленняў аб дэпаніраваных выплатах (сумах).

Выплату стыпендыі студэнтам і аспірантам ажыццяўляць у адпаведнасці з распараджэннямі па факультэтах з 15 па 17 даты кожнага месяца, а ў выпадку супадзення названых дат з выхаднымі днямі—у дні, папярэднія ім.

*Адк.: галоўны бухгалтар, дэканы факультэтаў.*

3.11. Выдачу разліковых лісткоў ажыццяўляць па ўсіх відах заработнай платы.

*Адк.: галоўны бухгалтар, дырэктар вылічальнага цэнтру.*

3.12. За паспяховае выкананне і перавыкананне тэматычнага плана работ на аснове загаду, які выдаецца не пазней 30 красавіка, выплочваць прэміі. Памеры прэміі і спісы прэміраваных узгадняюцца з прафсаюзнымі арганізацыямі кафедраў, лабараторый, факультэтаў і службаў.

*Адк.: галоўны бухгалтар, старшыня прафкама.*

3.13. Выплату аднаразовай матэрыяльнай дапамогі студэнтам ажыццяўляць па меры паступлення заяў.

*Адк.: галоўны бухгалтар.*

3.14. Аплочваць супрацоўнікам, як пагадзінную аплату, заняткі, якія праводзяцца імі за выкладчыкаў, якія знаходзяцца на лячэнні па лістках непрацаздольнасці (пры ўмове здачы гэтых лісткоў у бухгалтэрыю).

*Адк.: галоўны бухгалтар.*

3.15. На рабочых пасадах праводзіць даплаты за сумяшчэнне прафесій (пасад), пашырэнне зоны абслугоўвання ці павелічэнне аб'ёму выконваемых работ у межах да 100 працэнтаў сродкаў, па вакантнай пасадзе (тарыфнай стаўцы) прапарцыянальна фактычна выкананай рабоце.

*Адк.: галоўны бухгалтар.*

3.16. Устанавіць даплату ў памеры 10 працэнтаў ад мінімальнага заработку прыбіральшчыцам, якія прыбіраюць туалеты.

*Адк.: планава-фінансавы аддзел.*

3.17. Пры недастатковым фондзе аплаты працы ў падраздзяленнях навукова-даследчай часткі прадаставіць адміністрацыі права пераводзіць супрацоўнікаў на няпоўны рабочы дзень, няпоўны рабочы тыдзень з аплатай прапарцыянальна адпрацаванаму часу ці прадастаўляць ім адпачынак (неаплочваемы) тэрмінам да 3 месяцаў.

Пры спыненні фінансавання па выконваемай гэтым супрацоўнікам навукова-даследчай рабоце, выплочваць заработную плату ў памеры мінімальнага заработку да моманту звальнення па скарачэнні штатнай колькасці.

*Адк.: навукова-даследчая частка, галоўны бухгалтар.*

## РАЗДЗЕЛ IV. ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ І ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ.

4.1. Забяспечыць умовы для павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў усіх формаў навучання згодна з планамі факультэтаў.

4.2. Пашыраць навукова-тэхнічную інфармаванасць прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў універсітэта аб найноўшых дасягненнях навукі і тэхнікі шляхам арганізацыі выстаў у бібліятэцы.

*Адк.: дырэктар бібліятэкі, аддзел навукова-тэхнічнай інфармацыі.*

4.3. Садзейнічаць выхаду ў свет заказных манаграфій супрацоўнікаў універсітэта, якія працуюць над доктарскай дысертацыямі.

*Адк.: рэктарат.*

4.4. Камандзіроўкі ў замежныя ВНУ і фірмы (навуковая праца, стажыроўка, вучоба) афармляць толькі на аснове рэкамендацый вучоных саветаў факультэтаў (у выпадку асаблівай тэрміновасці), па рэкамендацыі дэканаў з наступным зацвярджэннем на вучоных саветах.

*Адк.: дэканы факультэтаў, начальнік упраўлення замежных сувязей.*

## РАЗДЗЕЛ V. ВЫТВОРЧАЯ І ПРАЦОЎНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

5.1. Супрацоўнікі і студэнты універсітэта абавязуюцца захоўваць вытворчую і працоўную дысцыпліну, палажэнні правілаў унутранага працоўнага распарадку і добрасумленна выконваць свае функцыянальныя абавязкі.

*Адк.: кіраўнікі структурных падраздзяленняў, прафбюро.*

5.2. Да 1.01.94 распрацаваць і выдаць вытворчы каляндар універсітэта на 1994 год.

*Адк.: рэктарат.*

5.3. Для прафесарска-выкладчыцкага саставу ўсталёўваецца шасцігадзінны працоўны дзень, у межах якога выкладчыкі павінны выконваць усе віды вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы.

*Адк.: дэканы факультэтаў.*

5.4. Для супрацоўнікаў, якія непасрэдна не ўдзельнічаюць у вучэбным працэсе, усталёўваецца пяцідзённы працоўны тыдзень. Пачатак і заканчэнне работы ўстанаўліваецца з 8.30 да 17.30 гадзін, а ў перадсвяточныя дні з 8.30 да 16.30.

*Адк.: начальнік аддзела кадраў.*

5.5. Своечасова даводзіць да ведама членаў калектыву нарматыўныя акты, якія рэгулююць пытанні аплаты працы, працоўных адносін, аховы працы ў ВНУ.

*Адк.: аддзел кадраў, агульна-прававы, аховы працы і тэхнікі бяспекі.*

5.6. Разглядаць скаргі і канфліктныя сітуацыі і прымаць па іх рашэнні ва ўстаноўлены тэрмін.

*Адк.: прафкам.*

5.7. Забяспечыць галоснасць і нагляднасць аб мерах заахвочвання за добрасумленную працу і дысцыплінарнага ўздзеяння да парушальнікаў працоўнай дысцыпліны, грамадскага парадку.

*Адк.: аддзел кадраў.*

## РАЗДЗЕЛ VI. АХОВА ПРАЦЫ

**Адміністрацыя абавязуецца:**

6.1. Своечасова праводзіць усе віды інструктажаў па ахове працы і супрацьпажарнай прафілактыцы, рэгулярна праводзіць навучанне і праверку ведаў тэхнікі бяспекі супрацоўнікамі, занятымі на работах з павышанай небяспекай.

Своечасова забяспечваць супрацоўнікаў універсітэта спецаддзеннем, спецабуткам і сродкамі індывідуальнай аховы ў адпаведнасці з дзеючымі нарматывамі.

*Адк.: аддзел аховы працы і тэхнікі бяспекі.*

6.2. Забяспечыць супрацоўнікам, якія працуюць у шкодных умовах, наступныя ільготы:

— бясплатную выдачу малака — 620 чалавек;

— даплаты да зарплаты — 138 чалавек;

— дадатковы адпачынак — 88 чалавек;

— скарочаны рабочы дзень — 131 чалавек (на адну гадзіну)

*Адк.: аддзел аховы працы і тэхнікі бяспекі, агульнаправавы аддзел, прафкам.*

6.3. Перыядычна праводзіць аналіз паветранага асяроддзя ў памяшканнях універсітэта, даваць ацэнку эфектыўнасці работы вентыляцыйных установак, праводзіць замеры ізаляцыі, асвятляльнасці рабочых месцаў, тэмпературнага рэжыму у лаларатарыях, аўдыторыях і іншых памяшканнях.

*Адк.: аддзел аховы працы і тэхнікі бяспекі, лабараторыя службы радыяцыйнай бяспекі.*

6.4. Скараціць да мінімуму колькасць вячэрніх заняткаў для выкладчыкаў-жанчын, якія маюць дзяцей школьнага ўзросту, выключыць выкладанне адпаведных заняткаў для жанчын, якія маюць дзяцей дашкольнага ўзросту.

*Адк.: загадчыкі кафедрамі, прафбюро факультэтаў.*

## РАЗДЗЕЛ 7. ЖЫЛЛЕВА-БЫТАВЫЯ ЎМОВЫ.

7.1. Падастаўленне жылой плошчы ажыццяўляць у адпаведнасці са спісам чаргі на атрыманне жылля з улікам абумоўленых законам ільгот. Скласці ільготны спіс супрацоўнікаў.

*Адк.: старшыня прафкама.*

7.2. Пры паляпшэнні жылёвых умоў дазволіць выдзяленне жылля супрацоўнікам універсітэта, якія маюць да 8 квадратных метраў жыл-

ПРАЕКТ

# КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

## ПРАФСАЮЗНАГА КАМІТЭТА І АДМІНІСТРАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА НА 1993 г.

плошчы на аднаго члена сям'і.
*Адк.: прафкам.*

7.3. Супрацоўнік, які аднойчы ўжо атрымаў кватэру ад універсітэта, можа разглядацца паўторна на паляпшэнне жыллёвых умоў толькі ў выпадку перадачы займаемай кватэры універсітэту для паўторнага засялення.
*Адк.: рэктарат, прафкам.*

### РАЗДЗЕЛ VIII. САЦЫЯЛЬНАЕ СТРАХАВАННЕ І ГРАМАДСКАЕ ХАРЧАВАННЕ

8.1. На падставе арт. 5 КЗаП РБ устанавіць для ўсіх катэгорый супрацоўнікаў універсітэта мінімальны чарговы адпачынак — 18 дзён.
*Адк.: рэктарат.*

8.2. Па дамоўленасці бакоў адміністрацыя можа прадастаўляць супрацоўнікам адпачынак без захавання заработнай платы (у тым ліку з наступнай адпрацоўкай) па сямейных ці іншых абставінах ад 3 да 30 каляндарных дзён.
*Адк.: рэктарат.*

8.3. Забяспечыць бесперапынную работу ўсіх кропак грамадскага харчавання (сталовыя, буфеты, кафэ) унісерсітэта. Дабівацца паляпшэння якаснага прыгатавання страў.
*Адк.: рэктарат.*

8.4. Ажыццяўляць рэгулярны кантроль за работай сталовых, буфетаў і кафэ ў мэтах паляпшэння санітарна-гігіенічных умоў і якасці прыгатавання ежы.
*Адк.: прафкам.*

8.5. Забяспечыць бесперапынную работу стала заказаў для выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.
*Адк.: прафкам.*

8.6. Забяспечыць супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта ільготнымі пуцёўкамі ў санаторыі, дамы адпачынку, пансіянаты, на дыетхарчаванне. Сумесна з рэктаратам набываць дадатковыя пуцёўкі на лячэнне і адпачынак за кошт фонду сацыяльнага развіцця універсітэта.
*Адк.: прафкам.*

8.7. Забяспечыць правядзенне адпачынку выкладчыкаў і супрацоўнікаў і канікулаў студэнтаў шляхам прадастаўлення пуцёвак на:
— санаторна-курортнае лячэнне;
— адпачынак па пацёўках міжнароднага турызму;
— адпачынак дзяцей супрацоўнікаў у дзіцячых піянерскіх лагерах.
*Адк.: прафкам.*

### РАЗДЗЕЛ IX. КУЛЬТУРНА-ВЫХАВАЎЧАЯ, СПАРТЫЎНА-МАСАВАЯ АЗДАРАЎЛЕНЧАЯ І МЕДЫКА-РАБОТА

9.1. Забяспечыць фінансаванне груп здароўя ў адпаведнасці з каштарысам работы прафкама.
*Адк.: прафкам.*

9.2. Аказваць падраздзяленням дапамогу ў арганізацыі экскурсійных паездак па гістарычных і культурных мясцінах, асабліва ў час адпачынку.
*Адк.: прафкам.*

9.3. Арганізаваць цэнтралізаванае забеспячэнне білетамі на канцэрты, у кіно і тэатры.
*Адк.: прафкам.*

9.4. Праводзіць урачыстыя вечарыны, прысвечаныя знамянальным датам, тэматычныя вечарыны, творчыя справаздачы народных калектываў, выставы народнай творчасці.
*Адк.: рэктарат, прафкам.*

9.5. Удасканальваць сістэму аздараўлення супрацоўнікаў універсітэта. Наладзіць улік чаргі тых, што мае патрэбу ў лячэнні і кантролі за якасцю лячэння.
*Адк.: прафкам.*

9.6. Арганізаваць на базе паліклінічнага аддзялення універсітэта і прафілакторыя медыцынскі агляд супрацоўнікаў па жаданню.
*Адк.: прафкам.*

9.7. З улікам экалагічнай абстаноўкі і ў мэтах своечасовага выяўлення захворванняў на працягу 1993 года правесці медыцынскую дыягностыку ўсіх супрацоўнікаў універсітэта.
*Адк.: прафкам.*



## ВЯСНА ІДЗЕ, ВЯСНЕ – ДАРОГУ!





ЗОРКАПАД

# ЯК ДРУЗЮ ПРАКАРМІЦЬ СЯМ'Ю?

***У нас у гасцях зноў гутарковае шоў «Карамболь». На зялёным біл'ярдным стале — новая фігура. Гэта* Аляксандр ДРУЗЬ *— ігрок, знаток, азартны чалавек і звычайны інжынер.***

**— Аляксандр акрамя таго, што вы выдатна гуляеце ў «Што? Дзе? Калі?» і ў «Брэйн-рынг», мы практычна нічога пра вас не ведаем. Хто вы ў нармальным жыцці?**

— У свеце? У свеце я інжынер-праграміст.

**— І наколькі ўдалы?**

— Аб гэтым трэба пытацца ў маіх кліентаў. Увогуле, пакуль не скардзяцца. Але я лічу не з першай дзесяткі па краіне.

**— І чым у асноўным вы зарабляеце сабе на жыццё?**

— А вось якраз праграміраваннем і зарабляю.

**— Але ж попыт на праграмістаў падае. Якім-небудзь відам злачыннай дзейнасці вы б змаглі зарабляць сабе на жыццё?**

— ??? Ну хіба што красці аўтамабілі. Мне даўно ўжо хочацца... У мяне «Масквіч-407», яму трыццаць год. Паўтара года ён ужо не ездзіць.

**— А грошы, якія апошнім часам з'явіліся ў тэлевізійных гульнях «Што? Дзе? Калі?», яны нейкім чынам дапамагаюць?**

— Ведаеце, я гуляю ў клубе ўжо 13 сезон, грошы з'явіліся толькі ў апошнія паўтара гады. А да гэтага часу нам ніхто ніколі нічога не плаціў, ніякіх ганарараў не існавала. Я не лічу, што гуляць на грошы — гэта «вельмі дрэнна». Гульня, не адзінае, але адно з нешматлікіх месцаў, дзе магчыма зарабіць грошы сваім розумам.

**— А цяжкай фізічнай працай вы б змаглі зарабяць сабе на жыццё?**

— Ну, не ведаю. Я, напрыклад, электрык пятага разраду, хаця гэта і не вельмі цяжкая фізічная праца. У свой час я працаваў на БАМе, там я атрымаў класіфікацыю бетоншчыка другога разрада... Як я ўжо казаў, умею вадзіць машыну. Напэўна, змог бы працаваць таксістам, як нашы эмігранты ў Парыжы. Яшчэ што? Здароўечка, канешне, ужо не тое, каб каменне на дарогах крышыць. Але, каб іншай магчымасці не было, карміў бы сям'ю фізічнай працай.

**— Аляксандр, а я вось памятаю, што вас аднойчы нават выгналі з гульні за падказку...**

— Так, гэта было пачаткам маёй вядомасці. Бо, як гаворыцца, добрымі справамі праславіцца нельга...

**— Ды і Уладзімір Варашылаў заўсёды неяк да вас уважлівы: «Сачыце за Друзем. Пакажыце мне Друзя».**

— Гэта ад вялікай любві. А што датычыцца той падказкі, то яе не было. Проста ў час абмеркавання я пачаў вельмі актыўна жэстыкуліраваць ў размове са сваім суседам і нават сказаў: «Паглядзі, якое глупства яны нясуць». А тэлеглядач, чыё пытанне абмяркоўвалася і які прысутнічаў у студыі, упаўнаважаны Варашылавым сачыць за залай, палічыў гэта за падказку. Ну і выгналі.

**— Уладзімір Варашылаў, у прынцыпе,— шэф усёй гульні. Ён для ігракоў з'яўляецца начальнікам у звычайным сэнсе гэтага слова?**

— Безумоўна.

**— Перад ім ігракі імкнуцца неяк «прагнуцца», дарадзіць?**

— Я не імкнуся. Як на самой справе?.. Ці спрабуюць акцёры «прагнуцца» перад рэжысёрам? Праўда, стараюцца зразумець, чаго ён хоча, якая яго творчая задума і ажыццявіць яе. А задума ў Варашылава адна — прыгожая гульня. Вось калі прыгожая гульня атрымліваецца, ён задаволены без усялякага «прагіба». Калі не — ён злосны.

**— У вялікіх калектывах таленавітых і здольных людзей заўсёды ёсць інтрыгі, плёткі, звадкі... «Што? Дзе? Калі?» мінаваў такі лёс?**

— Ва ўсіх камандах па-рознаму. Ды і сярод каманд не адназначныя выпадкі здараюцца. Але ў асноўным адносіны сяброўскія. Вялікіх інтрыг — я б не сказаў.

**— Скажыце, Аляксандр, у вас многа прыхільніц, вы адчуваеце на сабе іх увагу?**

— Увагу? Адчуваю. Але я не вельмі дыфе-рэнцырую прыхільнікаў на мужчын і жанчын.

**— А лісты ад прыхільніц у тайне ад жонкі, напэўна ж, хаваеце?**

— Не. Вы ведаеце, не пішуць. Некаторым ігракам пішуць і вельмі часта. А мне... У мяне вельмі складаны лёс: мне ні адна прыхільніца не напісала. Ці, можа, я не атрымаў. **З тэлебачання ж мне перадаюць лісты раззлаваных тэлегледачоў яшчэ з тых часоў, калі ў мяне быў імідж падказчыка, прыкладна такога** зместу: колькі можна?! Друзь увесь час бадзяецца па тэлебачанні, а яго ўжо не раз выкрылі ў несумленнасці. А вы такога чалавека паказваеце, як вам не сорамна?

**— Так. Не пазайздросціш. Але ўсё ж такі, які тып жанчын падабаецца мужчынам-інтэлектуалам?**

— Не ведаю. Ці вы канкрэтна ў мяне пытаецеся? Увесь час баюся адказаць за інтэлектуала, проста я сябе такім не лічу. Мне падабаюцца прыгожыя жанчыны. Брунеткі. Але прыгожыя, вельмі прыгожыя. Як мая жонка.

**— Пытанне на тэму вольнага часу. Вядомы герой О. Генры ў вольную гадзіну чытаў энцыклапедыю. У вас такой прыхільнасці няма?**

— Вы ведаеце, з задавальненнем чытаю энцыклапедыю. Але гэта толькі тады. калі ну, зусім ужо вольны час. Чытаю Бракгаўза і Эфрона, але не новага выдання.

У мяне ёсць некалькі старых тамоў. Вельмі цікава іх нават палістаць, калі зусім няма чаго рабіць. Такога, праўда, практычна не бывае.

**— А як вы пазбаўляецеся стрэсу пасля гульні?**

— **Я наогул ад любога стрэсу пазбаўляюся** старым бабульчыным спосабам: з горам трэба нераспаць. Але часам, пасля удалай гульні, напрыклад, настрой наадварот ўзняты.

**— Адзін філосаф аднойчы сказаў, што аб чалавеку больш правільна судзіць па яго пытаннях, а не адказах...**

— Ну, што я магу сказаць? Калі судзіць па пытаннях, то ў мяне з гэтай справай вельмі дрэнна. Як я не спрабаваў неяк падсунуць Варашылаву некалькі пытанняў, ён увесь час іх не прымаў. Так што з розумам у мяне, калі меркаваць па пытаннях...

**— Эклізіяст казаў: «Во многой мудрости много печалей, умножающий познания умножает скорбь». А Бэкан яшчэ ў XVII стагоддзі сцвярджаў — моц у ведах. Як суадносяцца для вас паняцці ведаў і моцы?**

— Па-першае, гэтыя два выказванні не супярэчаць адно аднаму: у ведах моц, але і шмат смутку. Чалавек, які шмат ведае, бачыць жыццё па-іншаму, і гэта дае яму сілы для жыцця. І. як ні дзіўна, прыносіць многа маркоты. Для мяне веды — гэта спосаб разбірацца ва ўсім, што знаходзіцца вакол мяне. Правільна ацэньваць сябе і, наколькі гэта магчыма, вырашаць пытанні, якія заўсёды паўстаюць перад табой.

**— А вось наконт сваіх праблем... Як вы іх вырашаеце?**

— Я спрабую вырашаць усё сам. І менавіта тады аказваецца, што нічога не ведаю. А самая складаная праблема: як пракарміць сям'ю.

**— А хатнімі справамі вы займаецеся? У вас ёсць якое-небудзь цікавае захапленне, можа, вы вяжаце?**

— На жаль, я нічога не вяжу. Мая жонка увогуле сцвярджае, што я не займаюся хатнімі справамі. Разумеце, глабальная мужчынская справа— адносіны паміж краінамі СНД ці мясцовая палітыка. Гэта для мужчыны. Ну яшчэ часам можна дзверы адрамантаваць, вядро вынесці, цвік убіць...

**— У якой-небудзь энцыклапедыі супраць прозвішча Аляксандр ДРУЗЬ і дзвюх дат — нараджэння і смерці, што б вы хацелі прачытаць?**

— Чалавек. Можна было б яшчэ дадаць — нядрэнны чалавек.

**Ягор ХРУСТАЛЁЎ і яго таварышы.**
**(«Карамболь»).**

*P. S.* **Лепшым пытаннем гульні стала пытанне студэнта-архітэктара Андрэя ЗБАРОЎСКАГА аб мудрасці і смутку, яно прынесла яму радасць перамогі і прэмію ў памеры тысячы рублёў.**

# ДЛЯ ЦЯБЕ

ПОДЫЎМ

## МОДА — ДОБРАЯ АКТОРКА

***Мода 1993—1994 гадоў запазычвае ідэі не толькі 20-х, 30-х, 70-х, 80-х гадоў, але і XVIII—XIX стагоддзяў. А ўвогуле, мода — добрая акторка, ёй па сілах нават у адной мадэлі сумясціць некалькі розных вобразаў. А нам яшчэ і лепей, таму што маніць спакусліва перспектыва быць адметным і своеасаблівым. Але пры ўсёй стракатасці моды ёсць адно, што аб'ядноўвае ўсе яе напрамкі — асацыяцыі з модай 60-х гадоў. Ствараецца ўражанне, што мадэльеры вельмі ўважліва вывучылі часопісы таго часу і кінуліся выкарыстоўваць іх ідэі, а гэта перш за ўсё даўжыня «міні» і шалёнасць колераў. Мастацтвазнаўца Беларускага Цэнтра моды Галіна МЯШКОВА — мой гід у лабірынце сучаснай моды.***

Не так даўно жанчыны аддавалі перавагу бясполаму спартыўнаму аддзенню. І вось дачакаліся! Дэвіз моды — жаноцкасць. Можа таму, што слабая палавіна, нарэшце, зразумела, што «слабай» быць не так ужо і дрэнна і... ацанўла сваю прыгажосць, падараваную прыродай. Над модай лунае вобраз Брыджыт Бардо, Мерылін Манро, «вока Элізабет Тэйлар».

Мяняецца жаночы вобраз, пачынаючы з прычоскі. Зноў на подыўмах начосы, шыньёны, накладныя валасы, якія сімвалізуюць вобраз жанчыны-лялькі ў адзенні «міні».

Эротыка рухае модай гэтага перыяду, і цяпер акцэнціруюцца не плечы, а грудзі і талія, і зразумела, ногі і клубы. Летняе адзенне асабліва сексуальнае. Жанчыны будуць насіць пераважна міні-спадніцы і міні-сукенкі або максі- і мідзі- з разрэзамі па баках, заўважце, да самых клубоў. Надзвычай моднымі становяцца «танцуючыя» спадніцы.

Матэрыяламі для новага аддзення могуць служыць гіпюр і асабліва модны чорны капрон. Але ў модзе не толькі празрыстыя і паўпразрыстыя тканіны, а і найбольш цяжкія: замша, велюр, вельвет, бархат. Вясной самы папулярны — трыкатаж. Адзенне з яго мяккае, заўсёды выйгрышна падкрэслівае постаць.

У модзе для моладзі «рэп» змяніў «Бітлз» і «Роллінг Стоўнз». І значыць, замест футболак і бейсболак казырком назад — выцяртыя джынсы «клёш» з расшытымі камізэлькамі, каляровыя кашулі і валасы да плеч...

«Але калі ўсё ж «хіп-хоп» мілы вашаму сэрцу і не хочацца развітвацца з гэтым напалову спартыўным стылем, то да традыцыйных красовак і яркай футболкі можна дадаць нечаканы элемент: 7—8 старых гальштукаў пераплесці жгутом і выкарыстаць замест пояса»,— раяць мадэльеры. Дзіўна? Што ж рабіць, калі маладзёжная мода ўжо некалькі гадоў як выбрала авангардны напрамак.

Нягледзячы на тое, што любая жанчына, як самая сапраўдная, выбірае ў новым сезоне высокія абцасы (магчыма, да 90 мм), усё-такі назіраецца тэндэнцыя да зніжэння іх вышыні да 40 мм. і ўскладнення канфігурацыі. Абцасы ўсё часцей нагадваюць форму катушкі ці цыліндра. «Насок» пры гэтым больш акруглы ці авальны.

Ну вось, мабыць, надыйшоў час прыпыніцца. Але адчуванне, што не змагала не толькі выкараскацца з моднага лабірынту, а нават не паспела зазірнуць у самыя цікавыя і патаемныя яго вугалкі. Я здаюся. Але магу дазволіць сабе маленькае адступленне аб набалелым і надзённым.



**ЧАМУ Ў МАГАЗІНАХ МАЛА МОДНАГА АЙЧЫННАГА АДЗЕННЯ?**

— Мода пачынаецца з тэкстыльнай прамысловасці,— лічыць **Галіна МЯШКОВА**. — У нашай краіне тым больш. Таму што айчынныя тканіны амаль заўсёды бедныя па каляровай гаме. Сапраўды, іх каларыстыку можна пералічыць па пальцах. Таму фантазіі мадэльераў абмежаваныя. Ствараць новыя мадэлі даводзіцца з такога вось не вельмі прываблівага матэрыялу.

Вяснова-летняя калекцыя адзення была прадстаўлена нядаўна шырокай публіцы ў беларускім Цэнтры моды, распрацавана ў адпаведнасці з асноўнымі напрамкамі развіцця моды і з... улікам тых рэсурсаў сыравіны, якія маюцца ў рэспубліцы. На здзіўленне былі там прыгожыя дэмісезонныя паліто ў камплекце з касцюмамі ў класічным стылі белага колеру (мадэльер Ніна Астапенка), трыкатажныя мадэлі (стваральнікі Таццяна Церахава і Маргарыта Сычова). Асабліва цікавымі былі работы Надзеі Прышчэпы і Вольгі Ламакі (так званая група перспектыўнага мадэліравання), а таксама Эльвіры Жвікавай (авангардная тэма з трыкатажнага палатна). Намаганняў прыкладзена шмат. Ці не будуць яны дарэмнымі? На швейных фабрыках з лёгкай рукі часта ўносяць карэкціроўкі ў новую мадэль: не хапае патрэбных тканін або фурнітуры. У выніку губляецца вобраз мадэлі. Вырабы ж, якія шыліся «па правілах», хутка раскупаюцца. Апошнім часам назіраецца яшчэ адна тэндэнцыя: скарачаюцца заказы Цэнтру моды на новыя распрацоўкі. Справа ў тым, што многія прадпрыемствы кінуліся ў пагоню за «зялёненькімі» (новае абсталяванне, станкі, фурнітура... — усё патрэбна). Шыюць у асноўным на замежныя фірмы, з іх жа сыравіны, па іх ліцэнзіі. Што зробіш? Рэальнасць заўсёды процістаіць мары...

**Ганна ЛАГУН.**

СТЫЛЬ

**У АПОШНІЯ ДВА ГАДЫ, ПОЎНЫЯ ПАДЗЕЙ, ЯКІЯ МОЦНА ЗМЯНЯЮЦЬ НАША ГРАМАДСТВА, АДБЫВАЮЦЦА ЗМЕНЫ І Ў СТЫЛІ АДЗЕННЯ — У ТЫМ ЛІКУ І Ў МУЖЧЫН.**

## ВЯРТАННЕ ЭЛЕГАНТНАГА МУЖЧЫНЫ

Паглядзіце на даваенныя фатакарткі сваіх дзядоў і прадзедаў: вы ўбачыце, што ў той час амаль кожны мужчына быў апрануты вельмі і вельмі прыстойна. І нават на фатакартках пяцідзесятых — ужо не настолькі «салодкіх» гадоў — шмат ладна апранутых мужчын. Закройшчыкаў калектывізавалі не так хутка...

І дзе гэтыя мужчыны? Можа, гэта толькі тыя рэдкія «спадары», якіх яшчэ магчыма час ад часу сустрэць на вуліцы — у паношаным, але добра пашытым пінжаку, не ў новых. але вычышчаных пантофлях, у капялюшы і гальштуку, нават калі іх уладальнік у сем гадзін раніцы выгульвае сабаку? Дома ён носіць кашулю, шарсцяную камізэльку і гальштук. Але часы даваенная элегантнасці прайшлі. Сёння, на жаль,— час «скуранак», «адзідасаў» і швэдраў. Час моды, якая хутка мяняецца, і рэчаў, якія хутка зношваюцца. Хіба сёння яшчэ хто-небудзь, хто пераліцоўвае паліто, мяняе ў кашулях варатнічкі і цыруе шкарпэткі? Напэўна, не. Аднак паняцце мужчынскай элегантнасці амаль не змянілася з таго часу, калі мужчына пачаў насіць касцюм у нашым разуменні гэтага тэрміну.

Гэты касцюм не вельмі рэагіруе на ідэі «прыгнечаных» наватарствам дызайнераў. Па-ранейшаму — засцежка спераду, штаны да самага нізу, два рукавы (прамыя), пэўныя колькасць гузікаў і падкладка (не абавязкова з фіялетавага шоўку з блакітнымі драконамі). Прыстойны мужчына, ад якога фірма патрабуе, каб яго знешні выгляд выклікаў давер, носіць шэры ці сіні касцюм, блакітныя ці белыя кашулі, гладкія швэдры, мяккія цёмныя чаравікі, паважнае паліто і добры гадзіннік, які адна не кідаецца ў вочы. Гэта такая ж традыцыя, як тая, што нарадзілася ў нас: бізнесмен — чалавек у скуранай куртцы з кальцом-пячаткай на пальцы. Праўда, і на Захадзе ёсць дрэнна апранутыя мужчыны. Але ў краінах, дзе сур'ёзнасць фірмы дыктуе работнікам знешні выгляд, «карпарэйт лук» (дзелавы выгляд) — такое ж бяспрэчнае патрабаванне, як своечасовы прыход на працу ці выкананне даручаных заказаў. Гэта датычыцца перш за ўсё банкаў, магазінаў, кансалтынг-фірмаў, юрыдычных кантор — усіх тых структур, якія маюць кантакты з кліентамі. Для таго, каб з'явіцца на работу ў касцюме, універсітэцкі дыплом не абавязковы.

Праўда, выклікае аптымізм тое, што можна ўсё ж такі ўбачыць маладых людзей, апранутых вельмі прыстойна. Парадокс нашага жыцця — варты касцюм (не абавязкова ад «Армані»!) каштуе танней за скураную куртку. Апрануцца на «еўрапейскі манер» у нас танней, чым дзе. Магчыма, у гэтай таннасці і хаваецца прычына пагоні за рознымі спартыўнымі касцюмамі? Аднак дзверы ў свет адчыніліся, і хочацца верыць, што большасць мужчын убачыць розніцу паміж строгай элегантнасцю прыезджага бізнесмена — шведа і выглядам мясцовага вулічнага гандляра.

## РАЗ ЦУКЕРКА, ДВА ЦУКЕРКА — ДЗЕНЬ ПРАЦУЙЦЕ

***Зразумела, ты не поўная, ты — элегантная. І ўсё ж не здаралася яшчэ такога ў свеце, каб нават прыгажэйшая з прыгажунь не марыла стаць яшчэ больш прывабнай. Такім чынам; каб не набраць залішнюю вагу, неабходна:***

— з'еўшы пірожнае, каля трох гадзін займацца мыццём бялізны.

— закусіўшы цукеркай, пісаць па меншай меры гадзіну;

— адзін шакаладны «батончык» неабходна «адпрацаваць», друкуючы на машынцы каля палутара гадзін;

— порцыя шакаладнага марожанага «каштуе» 45 хвілін пілавання дроў;

— дзве лыжачкі цукру ў вашай гарбаце даюць энергію для прасавання на працягу цэлага дня...

Задумайся і над тым, што з выпарваннем вады з арганізму не выпарваецца ні адзін грам тлушчу. Больш таго, стакан салодкай гарбаты, выпіты пасля абеду, здольны на працягу месяца дадаваць да вашай вагі яшчэ адзін кілаграм, калі наведваць баню адзін раз у тыдзень.

Есці лепш часцей, але ў невялікай колькасці.

Адпіхвай ад сябе тлушч і ласункі, а таксама мучныя вырабы тваіх бабулек. Абмяжоўвай і выкарыстанне прадуктаў, якія ўзбуджаюць апетыт (розныя вострыя прыправы: хрэн, перац, гарчыца, воцат, соль, аджыка).

Не варта бавіць сябе абяцаннем пачаць новае жыццё з панядзелка, пачынай сёння.

**Г. ГАЛЬЧАНЮК,**
**урач.**

ВІДАВОЧНАЕ-НЕВЕРАГОДНАЕ

## НЕАБМЕЖАВАНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

***Аказваецца, наяўнасць у чалавека звышпамяці зусім не азначае, што ягоны мозг мае нейкае адхіленне ад нормы. Добра вядома, што наша памяць мае неабмежаваныя патэнцыяльныя магчымасці. Буйнейшы сучасны матэматык і кібернетык фон Нейман яшчэ некалькі гадоў таму зрабіў сенсацыйнае паведамленне: па яго меркаванні, чалавечы мозг можа ўмясціць усю інфармацыю, якую ўтрымліваюць мільёны кніг, што знаходзяцца ў бібліятэцы імя Леніна ў Маскве. Пытанне толькі ў тым, як адшукаць гэты скарб сярод тайнікоў нашага мозга.***

Прыкладаў з фенаменальнай чалавечай памяццю ў гісторыі больш чым дастаткова. Напрыклад, Юлій Цэзар і Аляксандр Македонскі ведалі ў твар усіх сваіх вояў. А гэта да 30 тысяч чалавек. А Сенека быў здольны паўтарыць 2 тысячы не звязаных паміж сабой слоў, пачутых толькі раз. Вялікі рускі шахматыст Алёхін гуляў «усляпую» па памяці з 30—40 партнёрамі адначасова.

Самвэл Гарыбян, якога сёння завуць чалавек-камп'ютэр, не меў фенаменальнай памяці ў дзіцячыя гады. А пачалося ўсё з таго, што ў 1983 годзе студэнту Гарыбяну зрабілі аперацыю на вочы. Як быць з вучобай? Не маючы магчымасці канспектаваць іх, Самвэл пачаў уважліва слухаць лекцыі. Ужо тады ў яго нарадзілася ідэя стварэння пэўных прыёмаў запамінання. У пошуках такой методыкі ён шмат увагі надаў псіхалогіі.

Неяк Самвэл задумаўся над пытаннем: «Чаму мы звычайна запамінаем на ўсё жыццё тую інфармацыю, якую атрымалі ў дзяцінстве?» Можа таму, што заставаліся пустыя месцы ў сістэме памяці? Не. Проста ў адрозненні ад дарослых, дзеці здольныя ўсю атрыманую інфармацыю прапусціць праз сэрца, што садзейнічае моцнаму захоўванню інфармацыі ў памяці.

Сучаснае жыццё перашкаджае чалавеку паўнацэнна здзіўляцца, захапляцца, перажываць, радавацца, цешыцца эмоцыямі, як гэта робяць дзеці.

Толькі адзінкам удаецца захаваць і пранесці гэту здольнасць праз усё жыццё. Адказваючы на пытанне: «Ці можна вярнуць згубленыя магчымасці?», С. Гарыбян гаворыць: «Амаль усе нашы ўспаміны з дзяцінства звязаны з пэўнымі эмоцыямі. Таму я прыйшоў да высновы, што для добрага запамінання трэба выклікаць у сабе гэтыя эмоцыі штучным спосабам і падвесці іх пад кожную новую адзінку інфармацыі. А пры неабходнасці зрабіць сюжэтныя звязкі з іх, якія б суадносілі адну інфармацыю з другой. Пры гэтым добра развіваецца вобразнае мышленне, аператыўнасць у прыняцці рашэнняў, мэтанакіраваная фантазія».

...У чэрвені 1990 года камісія на чале з галоўным рэдактарам савецкага выдання кнігі Гінеса І. Зайцавым прадыктавала Гарыбяну 1000 замежных слоў з перакладам (на арабскай, урду, бенгалі, ангельскай, дары, нямецкай, эсперанту і італьянскай мовах). Пасля таго, як ён за некалькі гадзін прыпомніў амаль усё, быў зарэгістраваны сусветны рэкорд. З той інфармацыі Гарыбян можа і сёння аднавіць 90 працэнтаў.

І ўсё-такі многія сумняваюцца, лічачы сістэму запамінання Гарыбяна яго прыроднай адоранасцю, якой можа карыстацца толькі ён. Аднак мноства лістоў, якія атрымлівае Самвэл з тых гарадоў, дзе праходзілі яго курсы. сведчаць адваротнае. Не, яго вучні не сталі ў адзін дзень Сенекамі і Алёхінымі. Але яны паверылі ў вялікі патэнцыял сваёй памяці і, галоўнае, ведаюць як яго скарыстаць. Магчыма, знойдзецца сярод іх і той, хто ўдасканаліць сістэму свайго настаўніка і зробіць яшчэ адзін крок наперад у развіцці чалавечых магчымасцей. Хто ведае, якія яны і ці ёсць у іх мяжа.

**А. ЮРЫН.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

220079, 1-ы Загарадны зав., 3.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

8 красавіка
Зак. 1701.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.